беларускай сцэнічнай харэаграфіі, як прафесійнай, так і аматарскай.

Ужыванне спосабу мастацкай інтэрпрэтацыі фальклорных узораў садзейнічае захаванню найбольш яркіх, характэрных рыс беларускай харэаграфічнай традыцыі, дазваляе ажыццявіць шматварыянтны падыход да канкрэтнага фальклорнага ўзору і стварыць вялікую колькасць разнапланавых твораў з улікам спецыфікі калектыву і ў залежнасці ад індывідуальнасці балетмайстра.

**І.Б.Вышынская,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## ФАРМІРАВАННЕ АСОБЫ БУДУЧАГА СПЕЦЫЯЛІСТА Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

Культура з'яўляецца мерай гуманізму грамадства, яго чалавечнасці. Тое грамадства знаходзіцца на больш высокім узроўні культурнага развіцця, дзе кожны індывід набывае рысы цэласнай, гарманічна развітой асобы і мае магчымасць удасканаліць і развіць сваю індывідуальнасць.

У цяперашні час намецілася тэндэнцыя да змянення асноў светапогляду. Гэта звязана з распадам тэхнагеннай культуры, што і зрабіла ўплыў на ўсе сістэмы грамадства, уключаючы адукацыю. У новых сацыяльных умовах складваецца новая канцэпцыя выхавання, адным з метадалагічных асноў якой з'яўляецца прынцып гуманітарызацыі адукацыі.

У канцы XX ст. сфарміраваўся новы тып людзей — вузкіх спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, прафесіяналаў у сваёй працы. Уласцівае ім тэхнакратычнае мысленне ўяўляе сабой светапогляд, для якога прыватная мэта важнейшая за агульначалавечыя інтарэсы, тэхніка найважней чалавека і яго каштоўнасцей, што часцей за ўсё прыводзіць да разбуральных з'яў у экалогіі, здароўі чалавека, маральнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але неабходна адзначыць, што ў кантэксце сучаснай адукацыі змяняецца і ідэал адукаванага чалавека. Побач з традыцыйнымі поглядамі складваюцца новыя ўяўленні пра чалавека і адукаванасць. Зараз адукаваны грамадзянін — гэта не столькі "чалавек, які шмат ведае", нават са сфарміраваным светапоглядам, колькі падрыхтаваны да жыцця, які арыентуецца ў складаных праблемах сучаснай культуры, здольны асэнсаваць сваё месца ў свеце. Адукацыя павінна ствараць умовы для фарміравання свабоднай асобы, для разумення іншых людзей, для фарміравання мыслення, зносін, нарэшце, практычных дзеянняў і ўчынкаў. Неабходна, каб адукаваны чалавек быў падрыхтаваны і да выпрабаванняў, інакш ён не зможа садзейнічаць пераадольванню крызісу культуры.

Сёння перад вышэйшай школай стаіць задача адраджэння інтэлектуальнага патэнцыялу краіны ў выглядзе гуманістычных каштоўнасцей і маральных ідэалаў. Мадэль сучаснага спецыяліста грунтуецца на такіх кампанентах, як светапогляд, агульная культура, інтэлігентнасць, прафесійныя веды і асабістыя якасці. У фарміраванні іх вялікую ролю іграюць сацыяльна-гуманітарныя навукі, якім адводзіцца асобая роля ў сістэме гуманітарызацыі адукацыі.

У цяперашні час вобразу "чалавека, які шмат ведае", звычайна супрацьпастаўляецца "асоба"; мэта адукацыі — сфарміраваць паўнацэнную творчую асобу. Другое патрабаванне, важнае для нашага часу, — разуменне і прыманне чужой культуры. Гэта азначае, што адукаваны чалавек з'яўляецца культурным і ў тым сэнсе, што ён прымае і разумее іншыя культурныя пазіцыі і каштоўнасці, умее знайсці кампраміс, разумее каштоўнасць не толькі ўласнай незалежнасці, але і чужой.

Ідэал адукаванага чалавека — цэласны, арганічны чалавек, які арыентуецца як у тэхнічнай, так і ў гуманітарнай культурах.

Адным з патрабаваннем да адукаванасці з'яўляецца фарміраванне маральнага, адказнага чалавека. Яно ставіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў плане асэнсавання чалавекам маральных рэалій дабра і зла, свайго месца ў жыцці, прызначэння, адказнасці за прыроду, лёс культуры, блізкіх і інш. Прыродазнаўчы светапогляд даецца сучаснай культурай і адукацыяй але ўсё больш адчуваецца недахоп гуманітарнага светаўспрымання, што павінна выправіць гуманітарызацыя адукацыі. Яна, у прыватнасці, прадвызначае:

1) пабудову сістэмы адукацыі з улікам прыроды і сутнасці чалавека;

2) асвойванне базавых асноў культуры ў працэсе прафесійнага навучання;

3) дэмакратызацыю навучальнага працэсу;

4) гуманны характар тэхналогій навучання;

5) выкладанне шырокага спектру сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, а таксама іх даволі аб'ёмнае прадстаўніцтва ў навучальным працэсе;

6) магчымую для навучэнцаў свабоду самарэгулявання "я"; дэідэалагізацыю, выбар уласных арыенціраў і каштоўнасцей, самасцвярджэнне ў працэсе навучання;

7) магчымасць і права рэалізацыі альтэрнатыўных канцэпцый навучання, пры гэтым з улікам прафесійных інтарэсаў.

Гуманітарызацыя адукацыі садзейнічае фарміраванню асобы спецыяліста вышэйшай школы не як выканаўцы вузкіх прафесійных функцый, а як асобы, здольнай вырашаць разнастайныя праблемы з гуманістычных пазіцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ